# ІНФАРМАЦЫЯ АБ АДУКАЦЫІ АСОБ, ЯКІЯ НЕ З'ЯЎЛЯЮЦЦА ГРАМАДЗЯНАМІ ПОЛЬШЧЫ

Пытанні, звязаныя з адукацыяй іншаземцаў, рэгулююцца наступнымі правіламі:

- Закон ад 14 снежня 2016 г. Закон аб асвеце (арт. 165 і 166) (далей - закон)
- Пастанова Міністра народнай адукацыі ад 23 жніўня 2017 г. *па пытанні адукацыі асоб, якіяне з'яўляюцца польскімі грамадзянамі і асоб, якія з'яўляюцца польскімі грамадзянамі, што праходзілі навучанне ў школах, што функцыянуюць у сістэмах адукацыі іншых дзяржаў (далей - пастанова)*

Асобамі, **адказнымі за ажыццяўленне абавязку школьнага навучання дзяцей, з'яўляюцца іх бацькі**, якія маюць поўную бацькоўскую ўладу і запісваюць дзіцё ў дзіцячы сад/школу.

## ПРАВІЛЫ ПРЫЁМУ ДЗЯЦЕЙ У ШКОЛУ

### Пачатковая школа

Калі вы жывяце ў раёне, у якім знаходзіцца дадзеная школа (зазвычай гэта школа, якая знаходзіцца блізка ад вашага дому), то звярніцесе ў яе. Дзеці прымаюцца на падставе заявы бацькоў, таксама падчас школьнага года (арт. 130 абз. 1 і 2 закона).

Калі прыём вучня патрабуе ўвядзення арганізацыйных змен у працы школы, якія могуць прывесці да дадатковых фінансавых наступстваў, дырэктар школы можа прыняць вучня пасля атрымання згоды з боку асноўнага органа – зазвычай гэта гміна (арт. 130 абз. 3 закона).

**Накіраванне ў іншыя, не раённыя школы:** (арт. 166 абз. 1 закона) Калі вучняў у пачатковай раённай школе шмат і прыём дзяцей-іншаземцаў будзе патрабаваць арганізацыйных змен (напр. стварэнне новых класаў, працаўладкаванне настаўнікаў і г. д.), тады гміна можа вызначыць у якасці месца ажыццяўлення школьнага абавязку:
1) іншую грамадскую пачатковую школу, якую вядзе гэта ж гміна;
2) грамадскую пачатковую школу, які вядзецца іншай гмінай, пасля заключэння пагаднення з гэтай гмінай.

Калі няма такой магчымасці, войт/бургамістр/прэзідэнт горада звяртаецца да куратара, які вызначае пачатковую школу, у каторай дзеці будуць навучацца.

Помніце – калі пачатковая школа не хоча прыняць ваша дзіцё – Вы можаце звярнуцца ў асноўны орган – зазвычай гэта гміна на тэрыторыі якой вы жывяце.

**Бацька можа выбраць іншую школу**, чым тая, у раёне якой ён пражывае. У такім разе <u>дырэктар школы вырашае</u>, ці будзе прынята дзіцё. Калі – так, тады дырэктар школы, які прымае вучня, павінен паведаміць пра гэты факт дырэктара раённай школы (арт. 36 абз. 13 і 14 закона)

- Дзіцё прымаецца на падставе замежных дакументаў (агульная колькасць гадоў навучання ў краіне і за мяжой). Можа ўлічвацца узрост вучня і характарыстыка бацькоў.
- у сітуацыі адсутнасці дакументаў, якія пацвярджаюць суму гадоў школьнага навучання, на падставе кваліфікацыйнай гутаркі на польскай або замежнай мове, на якой гаворыць вучань.
- у грамадскія дзіцячыя сады, мастацкія цэнтры, на заняткі па развіцці інтарэсаў і здольнасцяў у адукацыйна-выхаваўчай установе, бесперапынная адукацыя ў пазашкольнай форме – ва ўмовах і ў рэжыме рэкрутацыйнага працэсу, якія датычацца польскіх грамадзян

## Сярэдняя школа

- дзіцё прымаецца на падставе замежных дакументаў (агульная колькасць гадоў навучання ў краіне і за мяжой). Можа ўлічвацца ўзрост дзіцяці і характарыстыкі бацькоў.
- у сітуацыі адсутнасці дакументаў, якая пацвярджаюць суму гадоў школьнага навучання, на падставе кваліфікацыйнай гутаркі на польскай або замежнай мове, на якой гаворыць вучань.
- Для мастацкіх цэнтраў, інтэрнатаў, на заняткі па развіцці інтарэсаў і здольнасцяў у адукацыйна-выхаваўчай установе, на кваліфікацыйныя прафесійныя курсы, бесперапынная адукацыя ў пазашкольнай форме – ва ўмовах і ў рэжыме рэкрутацыйнага працэсу, якія датычацца польскіх грамадзян

## ТЭРМІНЫ ПРАВЯДЗЕННЯ НАБОРУ

Тэрмін правядзення дадатковага набору і працэсу, у тым ліку **тэрміны падачы дакументаў** (арт. 154 абз. 1 закона):

- вызначае да канца студзеня кантрольны орган грамадскі дзіцячы сад, іншую грамадскую форму дашкольнага выхавання або грамадскую пачатковую школу (найчасцей напачатку сакавіка);
- вызначае да канца студзеня адпаведны куратар па адукацыі – у сітуацыі грамадскіх пачатковых школ для дарослых, I класаў грамадскіх сярэдніх школ, уступных класаў у сярэдніх школах, у якіх функцыянуюць двухмоўныя аддзяленні, і на першы семестр першых класаў грамадскіх галіновых школ II ступені і грамадскіх сярэдніх спецыяльных школ

Калі вучань, які прыбыў з-за мяжы **не можа прадставіць дакументаў, тады яго залічаюць** у адпаведны клас, а таксама **прымаюць** у школу **на падставе кваліфікацыйнага суразмоўя**. Суразмоўе праводзіць дырэктар школы, у сітуацыі неабходнасці, у удзелам настаўніка. **Калі вучань, прыбылы з-за мяжы не ведае польскай мовы, кваліфікацыйнае суразмоўе праводзіцца на замежнай мове, на якой гаворыць вучань**. У сітуацыі неабходнасці школа забяспечвае ўдзел у кваліфікацыйным суразмоўі асобы, якая гаворыць на замежнай мове, на якой гаворыць дзіцё (§ 12 абз. 1 і 4 пастановы).

Для паступлення дзіцяці ў школу звяжыцеся у выбранай школай і даведайцеся пра патрэбныя дакументы. Найчасцей неабходна падаць дадзеныя дзіцяці (імя, прозвішча, дата нараджэння, серыя і нумар пасведчання асобы), імёны і прозвішчы бацькоў, адрас электроннай пошты і нумар тэлефона бацькоў.

Для пісьмовай заявы трэба далучыць **заяву пра месца жыхарства** свайго і дзіцё.

*Школа можа даць свой узор заявы.*

## НЕОБХОДНЫЯ ДАКУМЕНТЫ

- **у грамадскія сярэднія школы**, калі дзіцё пражывае **ў мікраараёне або раёне** – па законе

- **у грамадскія пачатковыя школы** – калі дзіцё пражывае **за межамі раёна** і ў **грамадскія сярэднія школы** (ліцэй, тэхнікум, галіновая школа I ступені) вучні прымаюцца ў школы на **вольныя месцы** і кваліфікуюцца ў адпаведныя класы пасля выканання ўмоў, вызначаных для асобных школ, г. зн. напр. медычныя даведкі, медычнае або псіхалагічнае заключэнне, пісьмовая згода бацькоў, вынікі: выпрабаванняў фізічнай падрыхтоўкі, праверкі моўных магчымасцяў, пэўных здольнасцяў, абследавання на прыдатнасць

- **у грамадскія школы II ступені – на вольныя месцы на падставе дакументаў**:
  - ✓ атэстата або іншага роду дакумента, выдадзенага за мяжой, прызнаных дакументаў, якія пацвярджаюць у Рэспубліцы Польшчы базавае прафесійнае адукацыя або
  - ✓ канчатковага адміністрацыйнага вырашэння па пытанні пацверджання ў Рэспубліцы Польшчы базавага галіновага прафесійнага адукацыі
  - ✓ медычнай даведкі, медычнага або псіхалагічнага заключэння

- **у грамадскія сярэднія адмысловыя школы – на вольныя месцы на падставе дакументаў**:
  - ✓ атэстата або іншага роду дакумента, выдадзенага за мяжой, прызнаных дакументаў, якія пацвярджаюць ў Рэспубліцы Польшчы сярэднюю адукацыю, сярэднюю спецыяльную адукацыю або канчатковага адміністрацыйнага вырашэння па пытанні пацверджання ў Рэспубліцы Польшчы або
  - ✓ канчатковага адміністрацыйнага вырашэння па пытанні пацверджання ў Рэспубліцы Польшчы сярэдняй або сярэдняй спецыяльнай адукацыі, або права на пачатак навучання ў вну або
  - ✓ атэстата або іншага дакумента, выдадзенага за мяжой, прызнаных з дапамогай настрыфікацыі перад 31 сакавіка 2015 г. за аналагічны атэстат сталасці, атэстата аб сканчэнні агульнаадукацыйнага ліцэя, атэстат аб сканчэнні профільнага ліцэя або атэстат аб сканчэнні тэхнікума,
  - ✓ медычнай даведкі, медычнага або псіхалагічнага заключэння

Агульнае правіла: адсутнасць вымогі аб прызнанні замежных дакументаў, за выключэннем тэхнікумаў і галіновых школ II ступені.
Правілы, якія рэгулююць правілы і рэжым працэсу з мэтай **акцэптацыі адукацыі, атрыманай за мяжой**:

- арт. 93-93h закона ад 7 верасня 1991 г. аб сістэме адукацыі (Веснік законаў з 2020 г. паз.. 1327, з 2021 г. паз. 4, 1237)
- пастанова Міністра народнай адукацыі ад 25 сакавіка 2015 г. *па пытанні працэсу для акцэптацыі атэстата або іншага дакумента, або пацверджання адукацыі або паўнамоцтваў для працягу навучання, атрыманых у замежнай сістэме адукацыі (Веснік законаў з 2015 г., паз. 447*).

## ФОРМЫ ПАДТРЫМКІ І ДАПАМОГІ Ў ГРАМАДСКІХ І ПРЫВАТНЫХ ШКОЛАХ

1. **падрыхтоўчыя аддзяленні**
   - палягчаюць адаптацыю ў школе, з ужываннем метадаў і формаў ажыццяўлення праграмы навучання да індывідуальных запатрабаванняў і магчымасцяў вучняў
   - настаўнікі, якія вядуць урокі, могуць атрымаць падтрымку з боку асобы, што валодае мовай краіны паходжання вучня
   - максімальная колькасць вучняў – 15
   - колькасць гадзін заняткаў у тыдзень:
     - ✓ у пачатковай школе: для I–III класаў – мін. 20 гадзін.
     - ✓ для IV-VI класаў – мін. 23 гадзіны.
     - ✓ для VII і VIII класаў – мін. 25 гадзін.
     - ✓ у базавай школе – мін. 26 гадзін.

- Перыяд навучання працягваецца да завяршэння школьнага года, у якім вучань быў прыняты на падрыхтоўчае аддзяленне. Можа быць скарочаны або падоўжаны, але не больш за 1 школьны год

2. **дадатковыя гадзіны польскай мовы**
   - не меней за 2 навучальныя гадзіны на тыдзень
   - арганізуе школа
   - без часовага абмежавання

3. **дадатковыя гадзіны выраўнальных заняткаў**
   - калі ёсць неабходнасць папаўнення праграмнай розніцы
   - арганізуюцца па просьбе настаўніка
   - 1 навучальная гадзіна на тыдзень па дадзеным прадмеце.
   - максімальна на працягу 12 месяцаў
   - агульным чынам, макс. 5 навучальных гадзін для аднаго вучня (у тым ліку дадатковыя гадзіны ўрокаў польскай мовы і выраўнальных заняткаў)

4. **працаўладкаванне асобы, якая будзе дапамагаць настаўніку (так званы міжкультурны асістэнт)**
   - асоба, якая гаворыць на мове краіны паходжання дзіцяці
   - працаўладкаваны дырэктарам школы
   - да 12 месяцаў

5. **магчымасць навучання мовы і культуры краіны паходжання**
   - для вучняў, якія не з'яўляюцца грамадзянамі Польшчы, а абавязаных наведваць школу, дыпламатычнае або консульскае прадстаўніцтва краіны іх паходжання, што працуе на тэрыторыі Рэспублікі Польшчы або культурна-асветніцкае аб'яднанне дадзенай нацыянальнасці могуць арганізаваць у школе навучанне мовы і культуры краіны паходжання
   - мінімум 7 вучняў
   - максімальна 5 навучальных гадзін на тыдзень

6. **падтрымка па частцы выпускных экзаменаў** ( арт. 44 zzr абз. 7 закона аб сістэме адукацыі)
   - дзіцё, якое ў школьным годзе, у каторым прыступае да экзамену восьмых класаў або выпускных экзаменаў і карыстаўся псіхалагічна-педагагічнай дапамогай у школе, можа прыступіць да такога экзамену на ўмовах, якія падыходзяць яго адукацыйным патрэбам і псіхафізічным магчымасцям на падставе пазітыўнай ацэнкі педагагічнай рады.
   - дзеці з абмежаванымі ведамі польскай мовы могуць прыступіць да экзамену восьмых класаў і да выпускных экзаменаў (за выключэннем экзамену па замежнай мове) на ўмовах, якія падыходзяць яго адукацыйным патрэбам і псіхафізічным магчымасцям на падставе пазітыўнай ацэнкі педагагічнай рады (у сітуацыі экзамену восьмых класаў падрыхтоўваюцца спецыяльныя экзаменацыйныя лісты)
   - падрыхтоўка формы экзамену восьмых класаў і выпускных экзаменаў заснавана ў тым ліку на выкарыстанні адпаведнага спецыяльнага абсталявання і дыдактычных сродкаў (напр. двухмоўнага слоўніка), дадатковага часу на правядзенне экзамену, забеспячэння прысутнасці і дапамогай падчас экзамену памочніка настаўніка

## УСЕАГУЛЬНАЕ АБАВЯЗКОВАЕ НАВУЧАННЕ

Кожнае дзіцё ва ўзросце ад **6** да **18 гадоў** абавязана вучыцца.

## НУЛЯВЫ КЛАС

Дзіцё ва ўзросце 6 гадоў абавязана прайсці **гадавую дашкольную падрыхтоўку** (так званая «нулёўка») ў дзіцячым садзе, дашкольным аддзяленні ў пачатковай школе або ў іншай форме дашкольнага выхавання. Гэты абавязак пачынаецца з пачаткам школьнага года ў каляндарным годзе ў якім дзіцяці споўніцца 6 гадоў.

Калі колькасць дзяцей, якім гміна абавязана забяспечыць магчымасць карыстання дашкольным выхаваннем, якія жывуць на тэрыторыі гімны, пададзеных падчас набору ў дзіцячы сад/дашкольнае аддзяленне пачатковай школе перавысіць колькасць месцаў у гэтай установе, тады дырэктар дзіцячага саду /пачатковай школы паведамляе пра непрыняцце дзіцяці войта /бургамістра/прэзідэнта горада. У гэтым выпадку войт /бургамістр/прэзідэнт горада павінен у пісьмовым выглядзе вызначыць бацькам іншую навучальную ўстанову, якая можа прыняць дзіцё (па меры магчымасці, размешчаную непадалёк).

**Бацькі** дзіцяці, якое абавязана праходзіць гадавое дашкольнае навучанне, абавязаныя:
- заявіць пра дзіцё ў дзіцячы сад/дашкольнае аддзяленне ў пачатковай школе
- забяспечыць рэгулярнае наведанне дзіцём заняткаў.

6-гадовае дзіцё можа пачаць навучанне ў 1 класе ў наступных умовах:
- па заяве бацькоў
- дзіцё павінна выяўляць псіхафізічную падрыхтаванасць да пачатку навучання,
- вырашэнне пра прыняцце дзіцяці ў школу прымае дырэктар школы на падставе:
  - ацэнкі псіхалагічна-педагагічнага кансультацыйнага цэнтра
  - калі ў папярэднім навучальным годзе хадзіў у дзіцячы сад.

7-гадовае дзіцё можа атрымаць адтэрміноўку на абавязковае навучанне:
- па заяве бацькоў, з прыкладанай ацэнкай псіхалагічна-педагагічнага кансультацыйнага цэнтра
- па вырашэнні дырэктара грамадскай пачатковай школы, у раёне якой дзіцё пражывае,
- заява падаецца ў каляндарным годзе, у якім дзіцяці споўніцца 7 гадоў, не пазней за 31 жніўня.
- такое дзіцё працягвае навучанне ў нулявым класе.

## ПАЧАТКОВАЯ ШКОЛА

**Абавязковае навучанне** дзіцяці пачынаецца з пачаткам школьнага года ў каляндарным годзе, у якім дзіцяці споўніцца 7 гадоў, а таксама працягваецца да заканчэння пачатковай школы, аднак не даўжэй чым да спаўнення 18 гадоў. **Абавязковае навучанне ажыццяўляецца ў выглядзе наведання пачатковай**, грамадскай або прыватнай школы.

**Бацькі** дзіцяці, якое абавязана навучацца ў школе, абавязаныя:
- напісаць заяву аб прыеме дзіцяці ў школу
- забяспечыць рэгулярнае наведанне дзіцем школьных заняткаў
- забяспечыць дзіцяці ўмовы для падрыхтоўкі да заняткаў;

## БАЗАВАЯ ШКОЛА

Пасля заканчэння пачатковай школы абавязковае навучанне ажыццяўляецца:
- **пры наведванні базавай школы**
- у якасці прафесійнай падрыхтоўкі ў працадаўцы.

Вучань, які скончыў базавую няпоўную сярэднюю школу да спаўнення 18 гадоў, можа таксама здзейсніць сваё абавязковае навучанне, наведваючы вну або кваліфікаваныя прафесійныя курсы.

**Бацькі** дзіцем, якое абавязана наведваць школу, па патрабаванні войта гміны/бургамістра/прэзідэнта горада), на тэрыторыі якога дзіцё пражывае, абавязаныя паведаміць яго пра форму ажыццяўлення школьнага абавязку дзіцяці і зменах ў гэтай галіне.

## НАСТУПСТВЫ НЕВЫКАНАННЯ АБАВЯЗКОВАГА ШКОЛЬНАГА НАВУЧАННЯ:

Бацькі павінны рэгулярна звязвацца з класным кіраўнікам дзіцяці і клапаціцца, каб рэгулярна наведваў школу (або быў на дыстанцыйным навучанні), а меркаваныя адсутнасці былі ў гэтым выпадку растлумачаныя. Правілы тлумачэння адсутнасці на занятках не рэгулююцца агульнапольскімі правіламі, яны вызначаюцца правіламі або статутам школ. Аб правілах тлумачэння адсутнасці можна спытаць класнага кіраўніка. Невыкананне абавязку гадавой дашкольнай падрыхтоўкі, школьнага абавязку або навучання, г. зн. неапраўданая адсутнасць у перыяд аднаго месяца на прынамсі **50% дзён заняткаў** можа прывесці да сур'ёзных наступстваў, напр. да пісьмовай заўвагі, штраф бацькам (аж да 10 000 злотых), скіраваць заяву ў Сямейны суд па справах непаўналетніх з просьбай пра вывучэнне сямейнай сітуацыі дзіцяці і пачынанне дзеянняў, у тым ліку абмежавання бацькоўскіх правоў.

## ДАПАМОГА Ў АДУКАЦЫІ, ЯКУЮ ПРАПАНУЕ ДЭПАРТАМЕНТ САЦЫЯЛЬНАЙ ДАПАМОГІ КІРАВАННЯ ПА СПРАВАХ ІНШАЗЕМЦАЎ

– *закон ад 13 чэрвеня 2003 г. аб прадастаўленні іншаземцам аховы на тэрыторыі Рэспублікі Польшчы* (інфармацыя датычыць сацыяльнай дапамогі, у тым ліку адукацыі, якая даецца іншаземцам, якія імкнуцца атрымаць міжнародную ахову)

Дэпартамент сацыяльнай дапамогі Кіравання па справах іншаземцаў у адпаведнасці з абавязкамі, якія вынікаюць з закона ад 13 чэрвеня 2003 г. аб прадастаўленні іншаземцам аховы на тэрыторыі Рэспублікі Польшчы, забяспечвае непаўналетніх іншаземцаў, якія карыстаюцца навучаннем і апекай у грамадскіх установах, пачатковых і базавых школах дыдактычнымі дапаможнікамі ў выглядзе **школьнай дапамогі** (у рэчавай форме або ў выглядзе ваўчараў на іх куплю). Для атрымання вышэй прадстаўленай дапамогі трэба даслаць актуальную даведку на бягучы школьны год.

Апроч таго вучні сярэдніх школ і дзеці, якія праходзяць абавязковую гадавую дашкольную падрыхтоўку, атрымоўваюць **школьныя падручнікі** на падставе пададзенай школьнай даведкі на бягучы школьны год.

Па меры магчымасці Кіраванне забяспечвае таксама пакрыццё выдаткаў на пазашкольныя і спартовыя заняткі. Для гэтага трэба падаць заяву.

Даведкі і заявы можна даставіць або адправіць у цэнтр для іншаземцаў (спіс цэнтраў разам з адрасамі знаходзіцца ў спасылцы https://udsc.gov.pl/uchodzcy-2/pomoc-socjalna/osrodki-dla-cudzoziemcow/mapka-osrodkow/) або ў Дэпартамент Сацыяльнай дапамогі Упраўлення па справах іншаземцаў, ul. Taborowa 33, 02-699 Warszawa, e-mail dps@udsc.gov.pl.

У выпадку з'яўлення пытанняў просьба звязацца з інфалініяй Упраўлення па справах іншаземцаў 47 721 75 75, у працоўныя дні з 9.00 да 15.00.

Матэрыялы пра адукацыю даступныя таксама ў базе пытанняў і адказаў ў 3 моўных версіях https://udsc.gov.pl/faqudsc/

Кіраванне па справах іншаземцаў стварыла таксама электронную скрынку для электроннай пошты edukacja@udsc.gov для задавання пытанняў, звязаных з адукацыяй.